| Гарады Валянціна Рабцэвіча | Studia numismatica Albaruthenica /Зборнік навуковых артыкулаў. Vol.1/ -- Мінск:Медысонт, 2011, С.7 – 15. |
|---|---|


І.Колабава (Мінск)

Успаміны

У жыцці Валянціна Навумавіча Рабцэвіча было шмат выпрабаванняў, але яго можна назваць шчаслівым чалавекам таму, што лёс узнагародзіў яго вялікім захапленнем нумізматыкай, падараваў яму Настаўніка з вялікай літары – Івана Георгіевіча Спаскага.

Валянцін часам, любіў называць сябе “дзіця горада” – і гэта на самой справе было так, хаця нарадзіўся ён у вёсцы. Пра гарады, што трывала ўвайшлі ў жыццё Валянціна Навумавіча, і пойдзе далейшая гаворка.

У **Мінску** прайшла асноўная частка жыцця Валянціна. Ён па-своему любіў гэты горад, але ў ім працякалі штодзённыя падзеі. Мабыць таму, часцей Валянцін любіў узгадываць чатыры іншых горада, з якімі звязаў яго лёс.

Такімі гарадамі былі туркменская Кушка, аўстрыйскі Санкт-Пёльтэн, беларускі Гомель і расійскі Санкт-Пецярбург. У двух апошніх Валянцін меў магчымасць бываць час ад часу. Вяртанне ў Санкт-Пёльтэн і асабліва Кушку – гарады яго дзяцінства – засталося нязбытнай марай.

Валянцін нарадзіўся на радзіме бацькі ў вёсцы Краснае Кіраўскага р-на Магілёўскай вобласці 26 лістапада 1934 г.

Бацька яго – кадравы ваенны – паходзіў з сялянскай сям’і з невялікай вёскі Лазовая Буда каля вёскі Мышкавічы Магілёўскай губерні. У свой час, абраўшы далейшы лёс, ён паступае ў Кіраваградскую ваенную кавалерыйскую вучэльню.

Маці Валянціна вырасла ў сям'і вясковага святара і настаўніцы ў вёсцы Ганнаўка Херсонская губерні ва Ўкраіне. Яна вучылася ў Кіраваградскім медыцынскім тэхнікуме і стала медыцынскай сястрой.

Вельмі хутка пасля нараджэння сына сямья ў “цяплушцы” ад'язжае ў далёкую Туркменію на месца службы бацькі. Маленства Валянціна Навумавіча праходзіла ў **Кушцы** – самай паўднёвай кропцы тагачаснай савецкай краіны.

Сваеасаблівая прыгажосць гэтага края – горы, спякота, змеі і скарпіёны, чырвоныя ад кветак даліны назаўсёды засталіся ў яго памяці. Жылі, як і ўсе, вельмі незаможна. Ложкам немаўляці, па ўспамінам маці, служыла скрыня ад патронаў, што прынёс са службы бацька.

Выхоўваць Валянціна дапамагала яго любімая “бабуся” з матчынага боку. Мабыць, менавіта яна, настаўніца, заклала тую глебу, на якой потым вырас апантанны да гісторыі навуковец.

У чэрвені 1941 г. сям'я збіралася ў чарговую паездку ў Беларусь, але водпуск не адбыўся. Выехаць у Беларусь, дзякуй богу , не паспелі.

Ваенныя годы, як і для кожнай сям'і ў той час, былі вельмі цяжкімі. Бацька – на фронце, маці суткамі працавала ў вайсковым шпіталі, Валянцін заставаўся з бабуляй. Сям'я галадала. Маці распавядала, як сын абараняў чарапах ад старэйшых хлопцаў, якія хацелі зварыць з іх суп.

Валянцін яшчэ з дзяцінства вызначаўся талентам расказчыка. Ён заўсёды збіраў вакол сябе дзяцей сваімі аповедамі аб прачытаных і, мабыць, часткова прыдуманых гісторыях і прыгодах.

Па сканчэнню вайны, пры вяртанні ва Украіну на адным з чыгуначных прыпынкаў маці паслала Валянціна памяняць прыгожы рагавы грэбень – падарунак бацькі – на прадукты. Хлопчык вярнуўся з зялёным гуркам. Гэты гурок, Валянцін Навумавіч узгадываў, будучы ўжо ў шпіталі.

Бацька ваеваў у складзе 3 Украінскага фронту, скончыў вайну ў Аўстрыі ў званні падпалкоўніка, намеснікам начальніка штаба корпуса. Пасля вайны

маці з Валянцінам ад’язжаюць да бацькі ў невялічкі гарадок пад Венай – **Санкт-Пёльтэн**.

Пры афармленні дакументаў на выезд Валянціна памылкова запісалі як Валянціну – дзяўчынку – і таму пры перасячэнні граніцы яго закуталі і нібыта паклалі спаць. Ён узгадываў, як страшэнна перажываў час праверкі, вельмі баяўся, што высадзяць з цягніка. Але пагранічнік не стаў турбаваць дзіця і Валянцін, такім чынам, нелегальна перасёк савецкую мяжу.

Для дванаццацігадовага хлопчыка пачынаецца зусім новае жыццё, так не падобнае на тое, што прыйшлося перажыць. У Валянціна засталося шмат яркіх успамінаў аб жыцці ў пасляваеннай Аўстрыі.

Улетку разам з іншымі дзецьмі з сям’яў савецкіх вайскоўцаў ён адпачываў у горным піянерскім лагеры.

Узгадваў Валянцін таксама паездку на аўтамабіле з салдатамі на мясцовыя вінаграднікі, калі іх гаспадар, пабачыўшы ўзброенных савецкіх салдат, сам збіраў і выносіў на дарогу да машыны скрыні з вінаградам. Пазней гэта машына папала ў аварыю, а Валянцін цудам застаўся навад без драпінаў.

У 1947 г. сям’я вяртаецца на радзіму. Бацька атрымаў накіраванне на далейшую службу начальнікам аддзела ў Гомельскі ваенны камісарыят. У **Гомелі** прайшло школьнае юнацтва Валянціна. У 1952 г. ён скончыў тут сярэднюю школу.

У гэтым горадзе засталіся яго школьныя сябры, з якімі на ўсё жыццё захаваліся цесныя адносіны. Штогод улетку Валянцін прывозіў у Гомель да бацькоў на адпачынак сваіх дзяцей.

Гомель стаў горадам, які Валянцін вельмі любіў і ў якім заўсёды імкнуўся зноў і зноў пабываць. Валянціна вабіў Сож – дзіўная рака, на пясчаных водмелях якой, на самой справе, можна адпачыць ад усіх праблем.

Гомель – горад, дзе на бацькоўскай пішучай машінцы на пачатак 1960-х гг. ён бясконца перарабляў сваю кандыдацкую дысертацыю. Родныя доўгі час засыпалі пад строкат гэтай машынкі.

**Санкт-Пецярбург** – тады Ленінград – займаў асобнае месца ў жыцці Валянціна. Гэты горад стаў для яго святым месцам, да якога склаліся асобныя, трапятлівыя адносіны. Менавіта тут Валянцін Навумавіч сфарміраваўся як навуковец.

Пасля сканчэння ў 1956 г. гістфака БДУ і далейшай працы ў Арганізацыйнай групе Дзяржаўнага музея БССР Валянцін пасупае ў 1959 г. у аспірантуру аддзела нумізматыкі Дзяржаўнага Эрмітажа ў Ленінградзе.

Пражыў ён у гэтым горадзе не так ужо і доўга, але змог знайсці там шчырых сяброў. Супрацоўнікі аддзела нумізматыкі становяцца па-сапраўднаму блізкімі яму людзьмі. Іх імёны добра ведалі не толькі родныя Валянціна, але ў далейшым і яго калегі па рабоце ва ўніверсітэце.

Сяброўства Валянціна з супрацоўнікамі аддзела нумізматыкі розных пакаленняў працягвалася амаль 50 гадоў. Ён трывала заняў сваю нішу ў жыцці аддзела. На складанне такіх добрых адносінаў мабыць спрыяла не толькі творчая атмасфера ў аддзеле, але і пэўныя рысы характара самаго Валянціна – яго шчырая натура, сціпласць, апантаннасць у набыцці ведаў.

Паездкі ў Пецярбург былі заўсёды вялікім святам для Валянціна, ён вяртаўся адтуль нібыта аднойленым. Да гэтага горада ён імкнуўся далучыць многіх сваіх блізкіх, сяброў, студэнтаў. Шмат выпускнікоў гістфака памятаюць паездкі з Валянцінам Навумавічам ў Ленінград на музейную практыку.

Характар Валянціна быў няпростым. Ён быў чалавекам вельмі прыстойным, прынцыповым і часам жорсткім, асабліва, калі гаворка датычыла навуковай работы, але душа яго заўсёды была адкрыта для спачування і дапамогі.

Такім ён застаўся ў маёй памяці.

Мал. 1 У піянерскім лагеры (стаіць крайні злева). г. Санкт-Пёльтэн (Аўстрыя), 1946 г.



Мал.2 Валянцін з бабуляй з матчынага боку. в. Брацкае Мікалаеўскай вобл. (Украіна), 1949 г.



Мал. 3 Валянцін з бацькамі і сястрой. Гомель, 1954 г.



Мал. 4 На вайсковых зборах пасля сканчэння БДУ. Гомельская вобл., 1957 г.



Мал.5 Праца ў арганізацыйнай групе Дзяржаўнага музея БССР. Мінск, 1956 г.



Мал. 6 У археалагічнай экспедыцыі. Канец 1950-х – пачатак 1960-х гг.



Мал. 7 Праца над дысертацыяй. Гомель, пач. 1960-х гг.



Мал. 8 Ленінград, 24.11.1966 г.



Мал. 9 Мінск, 2004 г.



Мал. 10 У археалагічнай экспедыцыі. Буды, 2007 г.